# Падарожжа разам з Радзівіламі

16.02.2016

**Аўтар:** Яўген Пясецкі

**Культура**

**Яго можна здзейсніць у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Тут адкрылася выстаўка, арганізаваная пры падтрымцы кампаніі JTI. Гэты творчы праект ажыццёўлены сумесна з шэрагам літоўскіх музеяў. Выстаўка дае магчымасць бліжэй пазнаёміцца з падзеямі даўніны, якія не так добра вядомы большасці з нас, але з'яўляліся вельмі важнымі для свайго часу. Удзел у іх бралі прадстаўнікі знакамітага роду Радзівілаў і іх сучаснікі.**



За шклом музейных вітрын рэдкія выданні вялікай эпохі князёў.

Беларускі бок разам з іншымі экспанатамі паказвае матэрыялы «Трайчанскага» архіва» — комплексу дакументаў XVI—XIX стагоддзяў, якія былі сабраныя ў Слуцкім Свята-Троіцкім праваслаўным манастыры. Гэтыя тэксты адлюстроўваюць разнастайныя бакі жыцця грамадства мінулых стагоддзяў. Большасць з іх дагэтуль не выносілася на публічны агляд.



Пячатка з гербам «Ляліва» — узор майстэрскага ліцця і гравіроўкі.




Медаль у гонар 25-годдзя навуковай дзейнасці Эмерыка Гутэн-Чапскага.



Зброя, якая служыла магнатам і іх сучаснікам.